ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

'90 ЧАЦВЕР 15 ЛІСТАПАДА № 30 (1659)

ПРЭС-ЦЭНТР ПРАФКОМА

ПАВЕДАМЛЯЕ

## НЕАБХОДНА ІНВЕНТАРЫЗАЦЫЯ

ДОЎГАЯ дыскусія суправаджала пасяджэнне студэнцкага прафкома, якое адбылося 31 кастрычніка. Даклад намесніка дырэктара студгарадка Б. П. Пауса аб стане спраў па арганізацыі вольнага часу ў інтэрнатах быў несуцяшальны. Толькі ў «шасцёрцы» і «сямёрцы» больш-менш клапоцяцца аб гэтым. У астатніх інтэрнатах бяздзейнічаюць прафбюро і студсаветы, адмоўчваюцца каменданты. Не здавальняючы і стан матэрыяльнай базы: з 42 тэлевізараў, што стаяць у інтэрнатах, не працуюць 7, з 8 відэамагнітафонаў — 3, зламана ці наогул адсутнічае іншая радыёапаратура.

Не заўсёды выратоўваюць і дыскатэкі. Бо часам яны не абыходзяцца без інцыдэнтаў паміж жыхарамі і гасцямі, накшталт той бойкі, якая здарылася нядаўна ў інтэрнаце № 6.

Ёсць нараканні ў адрас дырэкцыі студгарадка і прафкома. У адказ на іх прафкомаўцы спасылаліся на цяжкасці, якія з'явіліся ў апошні час з набыццём апаратуры, мэблі і іншага інвентару для інтэрнатаў.

Прафком даручыў Б. П. Паусу правесці поўную інвентарызацыю спартыўна-культурнага інвентару ў інтэрнатах, а намесніку старшыні прафкома Г. У. Пацёкіну — стварыць камісію для паралельнай інвентарызацыі маёмасці, якая належыць прафкому.

На пасяджэнні было таксама разгледжана пытанне аб рабоце, праведзенай прафкомам па забеспячэнню студэнтаў, якія маюць патрэбу ў дыетычным харчаванні і прафілакторыі.

А. ЗАЙЦАЎ,
старшыня прэс-цэнтра студэнцкага прафкома.

ПАМЯЦЬ



Зямля ў Мінску і вакол яго паліта крывёю ахвяр часоў культу. Але ці шмат аб гэтым ведаюць? Напэўна, толькі сведкі і тыя, хто хоча ведаць.

Сёлетнія Дзяды ўшанавалі памяць загінуўшых у цяперашнім парку Чалюскінцаў і ля будынка рэспубліканскага КДБ. Крыж-капліца быў установлены на месцы расстрэлаў савецкіх вязняў.





З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## КАНФЕРЭНЦЫЯ ДЛЯ АКТЫВУ

1 ЛІСТАПАДА на факультэце прыкладной матэматыкі павінна была адбыцца чарговая справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя. Гэта ж так павялося, што ўсе студэнцкія праблемы: святкаванне Дзён факультэта, фарміраванне студэнцкіх атрадаў, цяжбы з дэканатам з нагоды стыпендыі і інтэрната, матэрыяльная і маральная падтрымка СТЭМа — на плячах у камсамола. Але чаму ж ён такі непапулярны?

Вось і на справаздачна-выбарную канферэнцыю прыйшлі члены старога саставу камітэта камсамола, прапанаванага новага і некалькі цікаўных радавых камсамольцаў. Атрымаўся сход камсамольскага актыву, на якім доўга дыскуціравалі наконт калектыўнага членства ў ЛКСМБ маладзёжных арганізацый.

Камсамол на факультэце не займаецца палітыкай. Асноўная работа — абарона студэнцкіх правоў. Ды й многія студэнты, якія ўдзельнічаюць у падрыхтаваных камітэтам камсамола мерапрыемствах, разупэўніліся ў камуністычных ідэалах. Ці варта губляць «спачуваючых»?

Сход камсамольскага актыву ФПМ прыняў рашэнне выбраць камітэт камсамола, які будзе выконваць ролю арганізацыйнага камітэта новай студэнцкай арганізацыі факультэта: да 1 снежня правесці сацыялагічнае апытанне на факультэце аб мэтазгоднасці стварэння студэнцкага саюза (ці іншай арганізацыі), распрацаваць праект праграмных мэт і асноўных напрамкаў работы гэтай арганізацыі і вынесці на шырокае абмеркаванне; вывучыць магчымасць калектыўнага членства створанай арганізацыі ў складзе камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Можа, гэта сапраўды шанц на выратаванне маладзёжнай арганізацыі, у якой ёсць патрэба? Але ствараць яе, пачынаючы з нуля, без фінансавай падтрымкі — неверагодна цяжка.

Калектыўнае членства — вось выйсце. Ствараючы сваю арганізацыю, студэнты прымаюць праграму і статут, устанаўліваюць памеры ўзносаў і размеркаванне бюджэту. У той жа час гэта арганізацыя з'яўляецца, згодна дагавору, калектыўным членам ЛКСМБ, адлічвае яму частку сродкаў бюджэту і мае права карыстацца яго дабротамі.

Што б ні казалі, пры ўсёй непапулярнасці камсамол пакуль — самая магутная маладзёжная арганізацыя, якая мае значныя грашовыя сродкі, спартыўныя комплексы, дамы адпачынку, турбюро.

Да таго ж, у адзіночку «карлікавым» маладзёжным арганізацыям будзе цяжка вырашыць шматлікія праблемы. Больш разумна працаваць усім пад адным дахам — інтарэсы моладзі розных палітычных і ідэалагічных поглядаў шмат у чым супадаюць.

А. БЯЛЯЕВА,
былы сакратар камітэта камсамола ФПМ.

## БІЯСФЕРА Ў НЕБЯСПЕЦЫ!

Сёння мы ўсё больш адчуваем пагрозу свайму здароўю. Зямля, у выніку неразумнай гаспадарчай дзейнасці чалавека, становіцца небяспечнай для жыцця. На жаль, разуменне гэтай праблемы не заўсёды выклікае правільныя дзеянні з боку некаторых дзяржаў. У выніку — біясфера зноў у небяспецы!

Міжнародная грамадскасць заклапочана пагрозай экалагічнай катастрофы, якая непазбежна прывядзе да гібелі ўсяго жывога на зямлі, калі мы будзем так па-варварску абыходзіцца з прыродай. Жаданне выратаваць жыццё на планеце прывяло да стварэння незалежнай Міжнароднай грамадскай арганізацыі «Грынпіс», філіял якой адкрыты ў гэтым годзе ў Маскве.

Вы таксама пры жаданні можаце падтрымаць абаронцаў прыроды і зрабіць уклад у справу захавання жыцця на зямлі. Не мае значэння сума грашовага ўзносу, галоўнае, каб ён быў. Нагадваем рахунак, на які вы можаце пералічыць грошы: КАМЕРЦЫЙНЫ БАНК «ЦЭНТРАКРЭДЫТ», РАХУНАК № 100345351.

У. БУДАНАЎ,
студэнт філалагічнага факультэта.

## КУРСЫ ВАДЗІЦЕЛЯЎ ПРАПАНУЮЦЬ

«У мяне звычайная мара — атрымаць вадзіцельскія правы. Але я ведаю, якія чэргі на тыя курсы...

Р. КАВАЛЁЎ,
супрацоўнік».

Можам паведаміць прыемную інфармацыю для жадаючых атрымаць вадзіцельскія правы. На базе Маскоўскага раённага спартыўна-тэхнічнага клуба ДТСААФ у Доме ваеннатэхнічнага навучання (вул. Сямашкі, 13) дзейнічаюць курсы па падрыхтоўцы вадзіцеляў легкавых аўтамабіляў.

Адміністрацыяй універсітэта былі выдзелены сродкі на набыццё двух аўтамабіляў для спартыўна-тэхнічнага клуба. І клуб узяў абавязацельства штогод рыхтаваць 120 вадзіцеляў з ліку прадстаўнікоў БДУ.

Згодна з Палажэннем аб арганізацыі заняткаў на курсах, сюды прымаюцца выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта, якія з'яўляюцца членамі ДТСААФ, маюць білет таварыства і плоцяць членскія ўзносы. Заявы студэнтаў аб пастаноўцы іх у чаргу разглядаюцца ў камітэтах ДТСААФ факультэтаў, а выкладчыкаў і супрацоўнікаў — непасрэдна ў камітэце ДТСААФ універсітэта на пасяджэнні яго прэзідыума.

Першачарговым правам на пастаноўку ў чаргу сярод студэнтаў карыстаюцца былыя воіны-інтэрнацыяналісты, актывісты абароннага таварыства, якія з'яўляюцца членамі камітэтаў ДТСААФ факультэтаў ці распаўсюджвальнікамі латэрэйных білетаў таварыства, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім і спартыўным жыцці універсітэта і не маюць вучэбных запазычанасцяў ці парушэнняў правілаў жыцця ў інтэрнаце.

З ліку выкладчыкаў і супрацоўнікаў першачарговым правам карыстаюцца ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і былыя воіны-інтэрнацыяналісты, члены ДТСААФ, якія садзейнічаюць актывізацыі абаронна-масавай і спартыўнай работы, прымаюць актыўны ўдзел у патрыятычным выхаванні моладзі і не маюць парушэнняў працоўнай і грамадскай дысцыпліны.

## Войска без палкаводцы?

УСЮДЫ павінен быць галава. Інакш — аніякага парадку не чакай. Анархія, адным словам. Ну хто, скажыце, дадумаўся? Гэта ж шкодніцтва нейкае.

Ціха-ціха, супакойцеся. Размова зусім не аб абароне Айчыны. Войска без палкаводцы нагадвае сёння завочны факультэт нашага універсітэта. Хадзілі чуткі, маўляў, ліквідуюць яго. Факультэт застаецца. Не будзе дэканата.

Дэканы факультэтаў скардзіліся ўжо даўно: «Навошта гэта двайное кіраўніцтва?» Непасрэдна на факультэтах складаліся вучэбныя планы, зацвярджаліся тэрміны выканання кантрольных работ, распрацоўвалася тэматыка курсавых і дыпломных... Потым ўсё гэта накіроўвалася на завочны, для карэкціроўкі, так бы мовіць. Іншым разам карэкціравалі так, што потым доўга разбіраліся разам. Яно ж заўсёды: калі многа нянек, дзіця абавязкова недагледжана. Вось і вырашылі звярнуцца ў рэктарат з прапановай скараціць адну «няньку».

З гэтай нагоды ў парадку дня пасяджэння вучонага савета універсітэта з'явілася пытанне аб рэарганізацыі завочнага факультэта. Амаль аднагалосна была падтрымана прапанова перадаць усе пытанні курыравання завочнага навучання непасрэдна на факультэты і ліквідаваць «завочны» дэканат.

— Як і ў любой новай справе, тут таксама ёсць свае плюсы і мінусы,— разважае былы дэкан завочнага факультэта Г. В. Мацвееў.— У першую чаргу паўсталі кадравыя пытанні — таго штату метадыстаў, які мелі мы, будзе недастаткова для работы на дзесяці аддзяленнях. Ды і студэнты, думаю, на першым часе сутыкнуцца з пэўнымі нязручнасцямі — пакуль яшчэ адладзіцца дакладны механізм работы па-новаму. У сувязі з такім вось драбленнем паўстае і наступная праблема. Сёлета мы зноў прымалі «платных» студэнтаў — іх 150 чалавек. Але ёсць факультэты, на якіх выказалі жаданне набываць другую спецыяльнасць 2—3 чалавекі. Ці мэтазгодна факультэту працаваць з імі, траціць час і сілы на такую мізэрную колькасць навучэнцаў?

Безумоўна, нейкія недапрацоўкі будуць. І ўсё ж, скасаваўшы дэканат завочнага факультэта і перадаўшы студэнтаў, якія набываюць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці, на профільныя факультэты, мы пазбавімся галоўнага — дубляжу і неразбярыхі ў вучэбным працэсе. Вось толькі, праўда, справы «па перадачы» чамусьці затармоўваюцца.

З. МІХНЕВІЧ

## УВАХОД НЕ ЗАБАРОНЕНЫ

МЯНЕ звычайна прадстаўляюць як вучонага, гісторыка, філосафа ці сацыёлага, але калі журналіст — гэта прафесія, то адна з маіх галоўных. І ў некаторых галінах, магчыма, я дасведчаны больш, чым хто-небудзь з савецкіх журналістаў. Мая першая публікацыя ў ленінградскай маладзёжнай газеце «Смена» з'явілася тады, калі мне было ўсяго дзесяць гадоў. Потым я пісаў увесь час: у старэйшых класах школы, калі быў студэнтам. І не ставіўся да артыкула ў факультэцкай газеце інакш, як да сур'ёзнай работы. Я пісаў пра тое, у чым быў кампетэнтны. Калі працапіс, тым не менш ён таксама карыстаецца папулярнасцю ў Германіі. Я не буду пералічваць іншыя выданні, з якімі супрацоўнічаю. Я трымаю сувязі з адной японскай, адной дацкай газетамі, прычым, пішу зусім розныя артыкулы. Часам неабходна адзін і той жа артыкул змясціць у розных выданнях, але без уліку інтарэсаў чытачоў не абысціся. Амерыканцаў больш цікавяць палітычныя праблемы, італьянская газета «Ринашита», напрыклад, просіць мяне пісаць агляды культурнага жыцця ў СССР, што зараз, зразумела, рабіць вельмі цікава.

# Рой Мядзведзеў:

# «Я пісаў пра тое, у чым быў кампетэнтны»

ваў настаўнікам і дырэктарам школы — на педагагічныя тэмы, друкаваўся ў раённай і абласной газетах. Працуючы ў выдавецтве намеснікам галоўнага рэдактара (перад гэтым я быў рэдактарам часопіса «Политехническое образование»), я пісаў артыкулы, нарысы. Ніводная з камандзіровак не была марнай: абавязкова прывозіў матэрыял. Артыкул у малавядомым органе, напрыклад, у «Магнитогорском рабочем», часам прыносіў мне большае задавальненне, чым матэрыял у якім-небудзь усесаюзным выданні. Адно з правілаў, якога я прытрымліваюся — пісаць штодзень. Журналіст павінен пастаянна нешта тварыць, занатоўваць думкі, уражанні, праблемы, таму што тады назапашваецца вопыт і ствараецца магчымасць хутка рэагаваць на тыя ці іншыя просьбы.

Я выпускаў уласны тоўсты літаратурна-палітычны часопіс «Двадцатый век». На жаль, выйшла ўсяго тры нумары, потым мне забаранілі яго выпускаць. Ён выходзіў адкрыта, з маім прозвішчам на тытульным аркушы. Я быў рэдактарам, мой брат у Лондане быў выдаўцом. Абодва часопісы выходзілі тыражом усяго 1000 экземпляраў, так што гэта было невялікае выданне. Праўда, звычайна рускія выданні за мяжой такім тыражом і выходзяць. На працягу апошніх дваццаці гадоў я супрацоўнічаю з многімі буйнымі газетамі Захаду.

У 50-я—60-я гады я пісаў у асноўным артыкулы па педагогіцы. Яны з'яўляліся практычна ва ўсіх педагагічных часопісах. Пачаўшы жыццё незалежнага вучонага, я працягваў супрацоўніцтва з заходнімі органамі друку і паступова яно стала пастаянным. Я з'яўляюся таксама пастаянным супрацоўнікам «Лос-Анжелес таймс» — па дагавору пішу ім артыкулы ад чатырох да шасці разоў у год. Гэта, безумоўна, не так часта, але самыя важныя пытанні нашага жыцця я асвятляю. Ёсць у мяне дагавор аб пастаянным супрацоўніцтве з ліберальна-буржуазнай газетай «Масаджера» і камуністычным выданнем «Ринашита» у Італіі, з газетай «Эль Паис» у Іспаніі, якая распаўсюджваецца сярод інтэлігенцыі, а таксама мае чытачоў ва ўсіх краінах Лацінскай Амерыкі. Я супрацоўнічаю на пастаяннай аснове з трыма нямецкімі выданнямі, адно з якіх я лічу самым лепшым у свеце, хоць і ёсць у ім шмат недахопаў. Гэта часопіс «Шпігель». Знаёмства з рознымі органамі друку дазваляе параўноўваць выданні. Ёсць яшчэ сувязі з газетай «Ди Цайт» і часопісам «Штерн». «Штерн», зразумела, больш слабы часо-

Нямецкія газеты дзейнічаюць па сістэме заказаў: дасылаюць лісты і просяць напісаць артыкул на тую ці іншую тэму. Я ведаю розныя школы журналістыкі: за дваццаць гадоў вывучыў стылі розных краін. Яны зусім не падобныя. Амерыканская журналістыка вельмі адрозніваецца ад нямецкай.

Я таксама нядрэнна ведаю жыццё карэспандэнтаў замежных газет у Савецкім Саюзе, іх цяжкасці. Вось ужо год, як я зноў друкуюся ў савецкай прэсе, сутыкаюся з роднай нашай савецкай журналістыкай. Так што пачынаю нанова пазнаваць і добрыя, і дрэнныя бакі яе жыцця. Журналіст, з аднаго боку, магчыма, самая прэстыжная прафесія ў многіх краінах, а з другога — няўдзячная. Усё залежыць ад таго, як паставіў сябе той ці іншы журналіст, як ён сябе вядзе. Гэта часткова распаўсюджваецца і на Савецкі Саюз. Журналіст можа весці ўласнае даследаванне, ён непадкупны, бескарыслівы, ён знаходзіць тое, што не можа знайсці нават следчы паліцыі. Ён забіраецца ў самыя патаемныя месцы, ён вядзе небяспечную, рызыкоўную гульню і выйграе, а часам і гіне.

Ёсць таксама, хоць і не вельмі многа, журналісты, якія пішуць усё, што іх ні папросяць. Хоць загадзя ведаюць, што гэта хлусня. Калі я праглядваю тое, што напісана пра кнігі Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна», то разумею, што інакш у той час нельга было. Да такіх журналістаў і публіка, і работадаўцы ставяцца з недаверам.

Адно з правіл, якога я заўсёды прытрымліваюся,— пісаць у спакойным тоне. Гэта гаварыў яшчэ Твардоўскі. Ён лічыў, што самае галоўнае, што яго захапіла ў маёй кнізе пра Сталіна,— зусім спакойны тон:

— Вы пішыце спакойна, а ўжо чытач павінен адчуваць эмоцыі: ад тых фактаў, якія вы выкладаеце, ад тых падзей, пра якія ён чытае. Вы не вылівайце свае ўласныя эмоцыі на старонкі.

Зараз, калі я пішу для савецкага друку, амаль ніводнага свайго артыкула не бачу без праўкі. Амаль заўсёды яна абвастрае выразы. І мне заўсёды гэта непрыемна, але я вымушаны з гэтым лічыцца.

Я пішу артыкулы для газеты «Московские новости», да мяне прыязджае намеснік галоўнага рэдактара Бандура, ноччу, у дванаццаць гадзін, і я падпісваю артыкул у друк, а назаўтра адкрываю газету і яго не пазнаю. Я не пісаў гэтага. Я пішу ў рэдакцыю, мне адказваюць: ужо ў гранках узяў дырэктар выдавецтва і дзве мае старонкі замяніў на дзве свае. Чаму? Прычым, думка, выкладзеная там, зусім супрацьлеглая той, якую выказваў я. Размова ішла аб вытоках сталінізму, і я гаварыў на гэтых старонках аб тым, што палітыка ваеннага камунізму пачалася раней грамадзянскай вайны, яшчэ вясной 1918 года. А потым пачалася грамадзянская вайна. А ў артыкуле — зусім наадварот. Пачалася грамадзянская вайна, якая выклікала неабходнасць палітыкі ваеннага камунізму. У першай думцы тыя, хто правяраў, угледзелі ўскосны намёк на памылку бальшавіцкай партыі, і ён замяніў мой тэкст сваім. Газета папрасіла ў мяне прабачэння, і я не стаў пісаць пратэст, каб не абвастраць адносіны паміж кіраўніцтвам АДН і газетай. Але як сказаў мне мой добры знаёмы Юрый Каракін, «патрэбна хадзіць у друкарню, калі хочаш, каб твой матэрыял выйшаў так, як ты яго напісаў, і нават сачыць, як ідзе набор і як выходзіць нумар. Толькі тады ты можаш быць упэўнены, што газета выйдзе з тваім уласным тэкстам». Але гэта выключны выпадак, калі ваш тэкст замяняюць на іншы. Гэта лічыцца даволі прымальным у нашай айчыннай журналістыцы. Ні адзін з трох артыкулаў, якія я напісаў у газету «Московские новости», не выйшаў у тым выглядзе, у якім я напісаў. Хоць невялікія і не надта сур'ёзныя, але праўкі былі.

Не менш непрыемныя і іншыя праўкі. Я, напрыклад, даю інтэрв'ю. Мне задаюць пытанне пра Салжаніцына. У сваім стылі я гавару, што не згодзен з Салжаніцыным, што ў яго творах шмат недахопаў, недакладнасцей, памылак. Што патрэбна выпраўляць іх, што Салжаніцын не заўсёды правы ў сваіх выказваннях, што ў сваіх творах ён часам дапускае свядомае скажэнне ісціны, напрыклад, у адносінах да хваробы Леніна. Я адкрываю газету «Советская Латвия», напрыклад, або «Московский комсомолец», чытаю сваё ўласнае інтэрв'ю, якое я напісаць не мог. «Салжаніцын даходзіць да ашалелага антысаветызму, палівае Савецкі Саюз паклёпам» і г. д.

Яшчэ калі я быў студэнтам, мой таварыш вучыў мяне: «Многае залежыць ад стылю выказванняў. Вы можаце сказаць чалавеку, што ён невук, і на вас пакрыўдзяцца. Можна ж сказаць, што ён недастаткова добра ведае прадмет. Гэта будзе адно і тое ж. Без патрэбы крыўдзіць людзей ніколі не трэба». Але, на жаль, у стылі савецкай журналістыкі або празмернае ўсхваленне, або наадварот: агульнае ахайванне, скажэнне тэксту аўтара. Асабіста мне гэта непрыемна.

Я лічу, што кожны журналіст можа ўсюды знайсці тэму для работы. Часцей за ўсё мае артыкулы — гэта падрыхтоўка да якой-небудзь вялікай работы ці частка яе. Я раю людзям пачынаць не з вялікай работы, а з малой. У кожным сюжэце павінен быць элемент дэтэктыва, якога няма, напрыклад, у матэрыялах Валкагонава ў «Октябре».

Ніколі загадзя не ведаеш, чым скончыцца той ці іншы артыкул. Адначасова я пішу тры-чатыры кнігі, чатыры—пяць артыкулаў. Часам даводзіцца напісаць артыкул за адну ноч. Хоць звычайна я працую над артыкулам доўга, але некалькі артыкулаў заўсёды знаходзяцца ў рабоце адначасова. Бывае, што матэрыял рыхтуецца дзесяць-пятнаццаць гадоў.

У гэтым годзе выходзіць адзінаццатая яго кніга «Герой — гэта той, хто непахісна сканцэнтраваны». Амаль тканінная шчыльнасць ва ўласнай думкарабоце дазваляе яму супрацоўнічаць з вядучымі выданнямі свету. Два кабінеты яго стандартнай маскоўскай кватэры запоўнены кнігамі, думкамі, творчасцю.

Запісала В. БАРАВІК,
студэнтка факультэта журналістыкі МДУ.

## ЗАЛАТАЯ СЯРЭДЗІНА

# Каму — верасень, каму — кастрычнік...

Пэўна, яшчэ не раз успомняць студэнты нядобрым словам леташнюю «бульбу», калі раптам даводзілася бегчы з поля і чакаць, пакуль скончыцца нудны дождж. У верасні ён быў надзвычай настойлівы, добрае надвор'е больш-менш усталявалася толькі ў кастрычніку. А якімі былі гэтыя месяцы ў мінулыя гады?

Начальнік аддзела аграметпрагнозаў Гідраметцэнтра БССР Галіна Андрэеўна ІВАНЧУК паведаміла, што за апошнія пяць гадоў па Мінскай вобласці ў верасні, як правіла, на 4—5 халодных і дажджлівых дзён больш, чым у кастрычніку. А ў першую і другую дэкады кастрычніка сухое і цёплае надвор'е спрыяла палявым работам.

Студэнты ж заўсёды выязджаюць на сельгасработы ў пачатку верасня. А ці патрэбны яны ў гэты час гаспадаркам? Звярнуўшыся з такім пытаннем да старшыні Мінскага гарадскога аграпрамысловага камітэта **Уладзіміра Філіпавіча РАДЗЕВІЧА**, можна пачуць адказ:

— Студэнты патрэбны нам менавіта ў кастрычніку. Бульба ў нашых саўгасах пераважна ранніх гатункаў, да пачатку верасня яна амаль уся сабраная. Студэнтаў не хапае на ўборцы караняплодаў, масавы збор якіх пачынаецца прыкладна з 15 верасня. Капуста ж наогул убіраецца з 1 кастрычніка. Таму студэнтаў звычайна і просяць затрымацца на палетках звыш месяца.

Дык ці не больш разумна адпраўляць студэнтаў на сельгасработы з другой паловы верасня? Тым больш, канкрэтны тэрмін пачатку вучэбных заняткаў нікім не вызначаўся, гэта справа саміх навучальных устаноў. Ёсць загад Міністра народнай адукацыі БССР М. І. Дземчука, які дазваляе пераносіць пачатак заняткаў да аднаго месяца.

Але традыцыя пачынаць навучальны год «бульбай» усталявалася ўжо ў нашых ВНУ, быццам, лічыцца, перарваўшы заняткі ў сярэдзіне верасня, можна пазбавіць студэнтаў набытых за два тыдні ведаў. Але на што тады разлічана навучанне, калі літаральна праз месяц веды знікаюць?

Вывад напрошваецца толькі адзін: традыцыю, якая садзейнічала цяжкаму становішчу і ў сельскай гаспадарцы, і ў вышэйшай адукацыі адначасова, лепш зламаць.

Н. БАХІР,
студэнтка факультэта журналістыкі.

## ЯК ВЫЖЫЦЬ?

# НЯХАЙ ДЫНАЗАЎРЫ СПЯЦЬ СПАКОЙНА?

Рынак узнік на самых ранніх стадыях чалавечай цывілізацыі, калі адбылася спецыялізацыя працоўнай дзейнасці і з'явіліся лішкі прадуктаў і вырабаў для абмену. Гэта быў натуральны ход падзей. З тых далёкіх часоў рынак стаў неад'емнай часткай жыцця людзей, развіваўся і ўдасканальваўся разам з развіццём чалавецтва. І зараз увесь свет, за выключэннем нашай краіны і некалькіх яе сатэлітаў, уяўляе сабой адзіную рыначную сістэму.

Партыйная наменклатура, якая і да гэтага часу правіць балем, на словах прызнаючы аб'ектыўнасць эканамічных законаў, на справе спрабавала іх абысці. Што з гэтага выйшла, мы бачым. Нарэшце, лёд кранууся — мы пачынаем уваходзіць у рынак, ствараць яго. Некаторых гэта пужае. Мяне, напрыклад, абнадзейвае. Тая эканоміка абсурду, якая існавала ў нас больш за 70 гадоў, магла трымацца толькі ў выніку нябачнага насілля над людзьмі і прыродай. Але чалавечыя і прыродныя рэсурсы не бясконцыя. Рана ці позна (шкада, што позна) мы павінны вярнуцца да рынку.

З тэорыі сістэм вядома, што любая сістэма (няхай то мурашнік ці дзяржава) з'яўляецца ўстойлівай і здольнай да самаразвіцця толькі ў тым выпадку, калі яе элементы звязаны паміж сабой адмоўнымі зваротнымі сувязямі. Рынак і ўсталёўвае такія сувязі, аптымізуючы вытворчасць і размеркаванне тавараў і паслуг. Не сакрэт таксама, што сістэма развіваецца тым хутчэй, чым больш ступеняў свабоды яна мае. Рынак і дае неабходную свабоду дзеянняў.

Пераходны перыяд заўсёды самы цяжкі. Немагчыма адразу пераскочыць ад эканомікі марнатраўства да эканомікі здаровага сэнсу, ад прынцыпу «усё забаронена, акрамя таго, што афіцыйна дазволена» — да прынцыпу «усё дазволена, акрамя таго, што забаронена законам». У эканоміцы квантавых пераходаў не бывае. Шлях ад дзяржавы як зброі падаўлення і прыгнечання да дзяржавы як памочніка, саюзніка, гаранта правоў і свабод — цяжкі і складаны.

Асабліва можа пацярпець у гэты перыяд навука — асноўная вытворчая сіла грамадства. Клопаты аб хлебе надзённым, задавальненні элементарных патрэб у адзенні, ежы, жыллі могуць надоўга адцягнуць увагу ад пытанняў накшталт «куды разбягаюцца галактыкі?». Прадпрыемствам пакуль непатрэбны новыя вынікі — хаця б укараніць тое, што вынайдзена вучонымі раней.

Навука — асаблівая, кволая і далікатная сфера чалавечай дзейнасці. Тут надзвычай істотная праблема кадраў. Капаць ямы ці забіваць цвікі можа любы чалавек, а вось рашаць, напрыклад, тэнзарныя ўраўненні — гэта не кожнаму пад сілу. На жаль, вельмі нямногія людзі схільныя да абстрактнага мыслення, вынаходніцтва, навуковай творчасці. Вучоны заўсёды знаходзіцца на мяжы нязведанага, у вечным пошуку ісціны.

Асабліва актуальная праблема навуковых кадраў у нашай краіне, дзе з кастрычніка семнаццатага у выніку ганенняў і рэпрэсій планамерна (гаспадарка то планавая) знішчаўся і без таго дастаткова тонкі інтэлектуальны пласт, «мозг» грамадства.

Зараз навуку перавялі на гасразлік. Няхай, маўляў, вучоныя самі шукаюць сабе грошы. У цэлым гэта справядліва. Але варта ўлічваць і спецыфіку навукі. Ніводнае прамысловае міністэрства, прадпрыемства, аб'яднанне не стане выдзяляць грошы на даследаванне спектраў аддаленых на мільёны светлавых гадоў квазараў, касцей даўно вымерšых дыназаўраў ці пяцімерных прастораў.

Усе павінны разумець, што любая навука мае сваю ўнутраную логіку развіцця. Таму кожнай навуковай установе, якая займаецца фундаментальнымі і пошукавымі даследаваннямі, варта давесці пэўны аб'ём дзяржбюджэтнага фінансавання (неабходна штогадовая карэкціроўка з улікам інфляцыі). Геніяльныя адзіночкі — гэта выдатна, але навука робіцца, у асноўным, навуковымі калектывамі, школамі, якія ствараюцца часам дзесяцігоддзямі. У навуковых школах выпрацоўваюцца свае метады мыслення і даследаванняў, традыцыі, правілы на аснове здаровай канкурэнцыі з апанентамі, дзе перамагаюць мацнейшыя. Фарміраванне навуковых школ — складаны дыялектычны працэс. Стварыць іх нялёгка, а вось разбурыць можна адным росчыркам начальніцкага пяра.

Базавае дзяржбюджэтнае фінансаванне будзе гарантыяй далейшага развіцця фундаментальных і пошукавых даследаванняў, стварэння апярэджваючага навуковага задзелу, захавання і ўдасканалення навуковых кадраў.

Ад фундаментальнай навукі можна патрабаваць толькі аднаго выніка — новых навуковых ведаў. Пытанні сувязі навукі з вытворчасцю, укаранення навуковых распрацовак і г. д. да фундаментальнай навукі адносін не маюць, хоць важнасць іх відавочная.

Маючы базавае дзяржбюджэтнае фінансаванне, навуковыя ўстановы змогуць на аснове атрыманага задзелу выконваць прыкладныя даследаванні як за кошт дзяржбюджэтных сродкаў, так і за лік дагавораў з заказчыкамі.

Пасля вайны японцы не пабаяліся ўкласці ў развіццё навукі, як кажуць, апошнія грошы. І выйгралі. Прыклад дастойны пераймання.

У. ПАПЕЧЫЦ,
вучоны сакратар НДІ прыкладных фізічных праблем.

# Аўдыторыя № 7



## АКАНІЦА «Аў № 7»

СЯРЖУК ЛАЎНІК, студэнт факультэта журналістыкі, упершыню пазнаёміў слухачоў са сваімі песнямі два гады таму, 5 мая на Свяце Друку ў парку імя Горкага. І праз некалькі дзён дэбют быў адзначаны «Чырвонай зменай» у матэрыяле пад рубрыкай «Новае імя».

Выступае Сяржук даволі рэдка, імкнецца не прапагандаваць і не афішыраваць, чым займаецца, і таму яго з поўным правам можна лічыць вядомым у вузкіх колах.

А песні яго — вартыя ўвагі. Меладычныя, напоўненыя прадчуваннем святла і радасці, рамантычныя і чыстыя. Яны вабяць прыгожымі вобразамі, настроем. Успрыманне іх патрабуе ўдумлівасці і будуецца на асацыяцыях. Музыка і словы штурхаюць думкі ў свет вобразных малюнкаў і падзей, якія для кожнага — асабісты, у залежнасці ад яго светаўспрымання.

Песні Сяржука створаны з шэпту дрэў і траў, карані якіх чэрпаюць моц і прагу жыцця з нетраў зямлі Беларусі, напеваў ветру і птушак, якія шукаюць прытулак на гэтай зямлі, промняў сонца, што грэюць родную зямліцу. Ён — тутэйшы. Яго вобразы — вобразы нашага краю.

У БЛІЖЭЙШЫЯ ТЫДНІ Ў МІНСКУ СЯРЖУК ЛАЎНІК ВЫСТУПІЦЬ З КАНЦЭРТАМ, ПРАДСТАВІЦЬ СВАЕ АПОШНІЯ ПЕСНІ. НАВЕДВАЙЦЕ «АЎДЫТОРЫЮ № 7»!

## Званы

*Па лугавіне роснай туман раскідаў вечар.*
*Над безданню маўклівай гучыць напеў званоў.*
*Зачараванай песняй хіне да небасхілу,*
*Ляціць тугі аскепкам у бязмежжа ўсіх бакоў.*

*Зрываецца імкліва з бурштынавай званіцы.*
*Нясе ўспамін самотны з глыбінь сівых вякоў.*
*Заблытаўшыся ў травах, у росах адаб'ецца.*
*Ляціць дзівоснай птушкай перагавор званоў.*

*У завоблачнай прасторы зліецца з песняй ветру*
*І стомлена нап'ецца з крыніц сярод лугоў.*
*Зноў ціха заспявае. Паўторыць гукі рэха.*
*І знікне назаўсёды ў бязмежжы ўсіх бакоў.*

СУТАРЭННЕ «Аў № 7»

## КВЕТКІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Горад, які яшчэ ўчора быў толькі сталіцай Беларусі, сур'ёзны і дзелавіты Мінск сёння амаль што цалкам пераменіў выраз твару. Адбылося гэта неяк раптоўна: прачнуліся, а сцяна-агароджа ля незакончанай будоўлі мясцовага маўзалея размалявана, распісана памінальнымі словамі. Але ўсё пачалося не ўчора, а значна раней. У горад прыйшло лета, а разам з ім у падземныя пераходы метро — вулічныя музыкі. Колькі было радаснага і абуральнага здзіўлення (у залежнасці ад светаўспрымання) у час нечаканай сустрэчы!

А першай ластаўкай вулічных выступленняў у Мінску быў акустычны гурт «Дзеці лейтэнанта Шмідта». У кожнага гэтыя імправізаваныя канцэрты выклікалі нязменную цікаўнасць. Не засталася ў баку і здымачная група ЦТ, якая прадставіла пазней гэты эпізод жыцця горада ў адной з перадач як яшчэ адну язву грамадства. Хоць гурт на той момант існаваў усяго некалькі тыдняў — дата заснавання 3 сакавіка 1990 года — атожылкі вядомага лейтэнанта паказалі слухачам нядрэнны прафесійны ўзровень. Тэкставая напоўненасць іх песень, на мой погляд, у традыцыях старога «Воскресенья», але падыход да абраных тэм больш арыгінальны. Што прымусіла іх спусціцца ў пераходы?

Вельмі просты адказ нават крыху расчараваў: «Есці хацелася.— сказалі хлопцы.— Мы ў той час у інтэрнаце жылі. Ну і... Акрамя таго, нам вельмі патрэбны быў саксафон». Вось так, забыўшыся на закамплексаванасць (колькі яе яшчэ ў нас!), яны выйшлі забаўляць горад і зарабляць на хлеб надзённы, на магчымасць далейшай творчай працы.

«Дзеці лейтэнанта Шмідта» існуюць і сёння, выконваючы, з іх слоў, «джаз-панк-недаблюз-вельмі-фольк-рок» і атрымліваючы ўзнагароды на розных фестывалях.

Па «Аўдыторыі № 7»
дзяжурыў
Зміцер ЛУКАШУК.

## Мімаходзь

...У ПРОДАЖЫ З'ЯВІЛАСЯ доўгаграючая плыта вядомай беларускай каманды «Мроя» (нарэшце, дачакаліся) пад назвай «Дваццаць восьмая зорка». «Мелодыя» павольна, але няўхільна здае свае пазіцыі пад націскам беларускіх выканаўцаў: хутка на паліцах зоймуць сваё месца адна плыта «Уліса» і дзве — запісаныя па выніках хіт-парада «Беларускай маладзёжнай». Хто наступны?..

...ЛІДЭР І ПРАДЗЮСАР поп-гурта «Макіяж» Арцём Цялегін, паслаўшы ў Амерыку менеджэру адной гуказапісваючай карпарацыі касету з лепшымі сваімі песнямі, атрымаў поўны здзіўлення ліст: у Амерыку прыйшла зусім іншая касета — з італьянскай полькай на абодвух баках. Відаць, «Макіяж» прыйшоўся да спадобы савецкім мытнікам...

...РОК-ГУРТ «ЫЫЫ» на чале з «вялікім арыгіналам» Базылём Шугалеем 13 кастрычніка даў канцэрт у кафэ ПК Белсаўпрофа, прадставіўшы новую праграму «Каханне шырынёю ў Свіслач». Вечар прайшоў з аншлагам і спадабаўся моладзі, чаго, праўда, не скажаш пра адміністрацыю і эстэтаў ад культуры...

...У НЬЮ-ЙОРКУ ўбачыла свет кніга Вітаўта Мартыненкі (вядучы «Нотнага аркуша» «Чырвонай змены») і Анатоля Мяльгуя «Праз рок-прызму», якая ўтрымлівае зборнік артыкулаў і інтэрв'ю. Беларускія крытыкі, адзначаючы гэтую падзею, падзяліліся: адны папракаюць у залішнім нацыяналізме, іншыя — у нястачы яго ж. Адно шкада: убачыць гэтую кнігу на свае вочы нам, напэўна, не давядзецца...

...ФЕСТЫВАЛЬ «НА ДОЎГІМ БРОДЗЕ», які адбыўся 20 красавіка, відаць, канчаткова страціў сваю папулярнасць. Сёлетняя яго праграма складзена ў асноўным з «салодкіх» песень і «ласкавых» гуртоў. Адзіныя, каго хацелася б вылучыць,— дуэт Кася Камоцкая і Лявон Шырын.

...ДАНЧЫК (БАГДАН АНДРУСІШЫН) і Лявон Барткевіч рыхтуюць да запісу новую сумесную плыту «Два анёлы». Як і папярэдняя («Мы адной табе належым»), яна будзе запісана ў ЗША...

# ДДТ: «Мастацтва — набліжэнне да Бога»



**— Юра, Вас ведаюць і любяць шмат людзей. Тое, што даносіце Вы, успрымаюць з асаблівай вастрынёй...**

— Хлопцы! Я ж не Кашпіроўскі, не гуру. Я — нармальны чалавек. Як і ўсе навокал. У мяне ёсць унутраны д'ябал і, напэўна, кавалачак Бога, дабро і зло. Я проста адчуваю, і ўсё. Не люблю рабіць прагнозы.

**— У Вашых песнях праглядваецца палітыка.**

— Прафесійнай палітыкай няхай займаюцца людзі, якія не могуць раскрыць сябе ў музыцы ці іншых сферах жыцця. Сёння ж усё наадварот: з року ідуць у палітыку. А для мяне галоўным заўжды быў чалавек, яго эмоцыі. Я не «палітызаваны» спявак. У мяне характар не той: не гнуткі. Калі-небудзь я, магчыма, стану мастаком. Я дзякую Богу за тое, што ўмею адчуваць. Усе песні напісаны даўно на нябёсах, я толькі адчуваю іх і прыношу ў дар людзям. На праспекце сярод людзей альбо ў пустыні — я заўсёды сам з сабою, я чую гэту музыку сам ў сябе, музыку барацьбы дабра са злом. Калі Гасподзь падаруе мне яшчэ і радок, атрымліваецца песня. Гэта вельмі цяжкая праца. І не ў тым справа, што прыходзіць першым — вершы альбо мелодыя. Я вершаў наогул не пішу. Усё атрымліваецца паралельна. Ды й галоўнае не гэта, а ідэя. Кажуць: спачатку было слова. У Махабхараце — вецер. А ў нас — ідэя.

**— Рок-братэрства распадаецца. На Вашу думку — гэта канчатковы развал?**

— Ні ў якім разе. Рок, зразумела, не такі, як быў калісьці. Раней было лёгка: яны ўсе «за», мы ўсе «супраць». А сёння больш волі. І, як казаў Бярдзяеў, чым больш волі, тым больш адзіноты. Кожны пайшоў сваім шляхам. Сённяшняя музыка ў залах стала сумнай. 3—4 чалавекі, якія па-ранейшаму спяваюць душой і сэрцам, не вернуць былых часоў. Засталася ілюзія. Сённяшняя музыка — на плошчах. І я прымаю законы жыцця.

**— ДДТ лічыцца самым высокааплочваемым гуртам...**

— Ну не. З другога боку, нам плоцяць нядрэнна. Напрыклад, за канцэрт у СКК мы атрымалі па 350 рублёў. Хаця ва ўсім свеце грошы атрымліваюць з продажу плытак, а не за канцэрты. Наша апошняя плыта ў тыражы пераваліла ўжо за паўтара мільёна, а хлопцы атрымалі за запіс па 70 рублёў.

**— Ці можа знікнуць рок?**

— У року галоўная ідэя — музыка, вершы — могуць змяніцца, але ніколі не знікнуць. А ідэя — гэта мастацтва. Мастацтва ж, у сваю чаргу, як казаў Платон,— набліжэнне да Бога.

Фота Дз. АРЛОВА.

**— Выступленне на фестывалі «Тры колеры» — веха на вашым творчым шляху?**

— Безумоўна. Наогул, гэты фестываль — веха ў рок-музычным жыцці Мінска...

**— Чаму вы ўтрох пакінулі «Бонду»?**

— А вам што, не падабаецца «Уліс»?

**— Падабаецца. Але ж...**

— Вось менавіта дзеля гэтага і пакінулі!

**— А вы не прадбачылі, што з вашым выхадам «Бонда» перастане існаваць як рок-калектыў?**

РОК-ВІЗІТКА

# «Уліс»: «Мы вяртаемся да сваіх каранёў»

— Гэта павінна турбаваць перш за ўсё тых, хто застаўся ў складзе «Бонды». А мы клапоцімся, як больш цікава выказаць свае думкі. У «Улісе» нам гэта значна лягчэй рабіць. Мы ствараем музыку, якая нам больш падабаецца.

**— Ці лічыце вы «закон аб мове» значнай падзеяй у жыцці рэспублікі?**

— Можна абмяркоўваць, што ў ім нам падабаецца, а што не. Але тое, што закон — значная падзея, безумоўна. І зараз мы прапагандуем мову даступнымі нам сродкамі. Сапраўднага беларускага року на сённяшні дзень не існуе і мы імкнемся яго стварыць.

**— А стод-рок? Ці можна яго назваць беларускім напрамкам?**

— Лічу, што «Мроя» не пакрыўдзіцца, калі скажу: на мой погляд, гэта ўсё дзіцячыя гульні— стод-рок, хард-рок... Я нават не ведаю, які рок мы граем. Галоўнае, выказаць сваю душу, а астатняе потым.

**— На чым будуецца ваша музыка?**

— На асацыяцыйных вобразах менавіта, а не на канкрэтнасці, як у іншых. І мы будзем ісці ў напрамку напоўненасці нашых песень.

**— Вы як беларусы у што верыце?**

— У Радзіму, зямлю, народ, родную мову. Карані паабсякаць наогул немагчыма. Іншая справа, цікавяцца імі ці не. Сёння мы пачынаем вяртацца да сваіх каранёў, гісторыі.

РОК-ВІЗІТКА

# «Чыстае срэбра»: «Культура Масковіі на 30 працэнтаў складаецца з беларускай»

**— Ваш гурт малады?**

— Таму саставу, у якім мы выступаем сёння, тры тыдні. А наогул мы існуем два гады.

**— Вы лічыцеся самым прафесійным гуртам у Мінску...**

— Так, але я не ведаю, што такое прафесіяналізм у року, асабліва ў нашай краіне, дзе непрафесіяналы граюць лепш. У нашым гурце ва ўсіх ёсць музычная адукацыя. Толькі ў гэтым сэнсе нас можна лічыць прафесіяналамі.

**— Якіх намаганняў каштаваў Вам выпуск першага магнітаальбома?**

— Год мы працавалі...

**— У Вас моцны вакал (адзначу: «ЧС» атрымала прыз за вакал), вы недзе вучыліся?**

— Я зараз вучуся ў Мінскім музвучылішчы па класу вакала.

**— Не якое месца Вы ставіце сябе сярод беларускіх гуртаў?**

— Натуральна, на першае...

**— Як Вы лічыце, на Захадзе Вас прынялі б?**

— Так, мы можам спяваць і па-англійску.

**— Існуе для Вас паняцце «беларуская культура»?**

— Безумоўна. І я лічу, што сёння беларусам патрэбны не палітычныя спрэчкі, а адраджэнне культуры. Прычым не савецкай беларускай, а культуры XV—XVI стагоддзяў. У музыцы гэта той жа «Полацкі сшытак» — цудоўнае «барока». Уся культура Масковіі на 30 працэнтаў складаецца з беларускай...

**— Чаму ж Вы не карыстаецеся беларускай мовай?**

— Для таго, каб спяваць па-беларуску, я павінен і мысліць па-беларуску. А нас з дзяцінства прывучалі да рускай мовы. Я не жадаю крывіць душою. Праўда, мы збіраемся зрабіць альбом на беларускай мове, але гэта будзе не рок, а «Полацкі сшытак» у сучаснай аранжыроўцы. Спяваю я там на стараславянскай, старабеларускай мовах і на латыні.

**— Калі Вы сустрэнеце верш, напісаны па-беларуску, які Вас ускалыхне, магчыма, пажадаеце напісаць музыку да яго?**

— Зразумела.

**— А Вы не спрабавалі шукаць?**

— Не... Разумееце, мы музыканты, і на першым месцы для нас стаіць музыка.

**— Ці магчымы нейкія змены ў беларускім року?**

— На сённяшні дзень я ведаю два моцныя гурты — металічны «Полтэргейт» і меладычны «Флэт», якія спяваюць «постбітлоў» па-англійску.

**— А ў якім стылі граеце Вы?**

— Меладычны арт-рок.

**— Хто для Вас арыенцір у творчасці?**

— У музыцы — «Лед Зеппелін», Пітэр Габрыел, Брой Іпо, Кейт Буш.

**— А ў вершах — Боб Грабеншчыкоў?**

— Барыс жа не першы сімваліст. Да яго былі і Байран, і Валошын, і Белы. Любімы паэт — Блок. Адсюль і нейкія паралелі з яго вершамі ў нашых песнях.

РОК-ВІЗІТКА

# «Насця»: «Незвычайнае заўжды ўспрымаецца не адразу»

**— Насця, Вы рамантык?**

— Па-праўдзе, я не ведаю, што гэта такое.

**— Гісторыя аб выратаванні Бутусавым Вас ад згвалтавання — гэта праўда?**

— Не, гэта жарты, смяшынкі «а-ля Зошчанка».

**— Вам цяжка працаваць на сцэне?**

— Цяжка, калі дрэнныя ўмовы. А так — нават прыемна.

**— Рок для Вас — магчымасць выявіць сябе?**

— Гэта для ўсіх так. Наогул, жыццё — гэта магчымасць не толькі выявіць, але і рэалізаваць сябе.

**— Ці можа рок загінуць?**

— А ён пастаянна гіне вось ужо на працягу 30 гадоў. А потым зноў адраджаецца. Гібель яго непазбежная, як і загніванне капіталізму.

**— У Вас вельмі складаныя тэксты. Вас часта не разумеюць?**

— Канешне. Бо незвычайнае заўжды ўспрымаецца не адразу.

**— Ваш гурт не камерцыйны. Як вам удаецца існаваць?**

— Сама здзіўляюся, але нас запрашаюць на канцэрты, цікавяцца намі.



**— Чаму гурт назвалі Вашым іменем?**

— Выпадкова. Проста для больш зручнай назвы... Наогул назва рэдка адпавядае зместу і накіраванасці гурта.

**— Калі Вам даводзіцца выступаць разам з металічнымі гуртамі, гэта не ўскладняе ўспрыманне Вашай музыкі?**

— Не, у час нашых песень усе апамятваюцца, супакойваюцца...

**— Тэксты Вашых песень — вобразы, якія ствараюць настрой. Вы не любіце канкрэтыку?**

— Чаму, мне падабаюцца вострыя тэксты, калі ўсё добра і прыгожа зроблена. Але мне бліжэй «намацванне» побач, дзе вобразы ў дымцы. Гэта настройвае на глыбокі роздум.

**— Жанчына ў року — гэта прыкмета эмансіпацыі?**

— У нашай краіне гэта рэдкі выпадак. Але я лічу, што жанчына ў музыцы — гэта цікава, дзякуючы «бзікам» у яе галаве...

Фота Дз. АРЛОВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

Заказ 2028.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.